# З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ, СЯБРЫ!

СЁННЯ НАША СЛОВА ДА ВАС, ПЕРШАКУРСНІКІ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

Год выдання трэці
№ 25 (83)
СЕРАДА 1 ВЕРАСНЯ 1971 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Цана 2 кап.



Гэта толькі шасцёра першакурснікаў з новага папаўнення Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

Светлыя ўсмешкі, ясныя мары — юнацтва выбірае свой шлях у жыцці.

У вялікую студэнцкую сям'ю ўступілі Георгій Дашкевіч (факультэт фізічнага выхавання), Ала Сабаленка і Раіса Каган (механіка-матэматычны факультэт), Алег Верамейчык (фізічны факультэт), Вольга Свішчова (механіка-матэматычны факультэт) і Юрый Шаршакоў (гісторыка-філалагічны факультэт), якіх вы бачыце на нашым здымку.

## УНІВЕРСІТЭЦКІ ТРЫМАЙЦЕ КРОК!

Дарагія першакурснікі!

Рэктарат, партком, мясцовы камітэт, прафком і камітэт камсамола горача і сардэчна віншуюць вас з уступленнем у дружную шматмільённую сям'ю савецкіх студэнтаў.

Вы паступілі ва універсітэт у знамянальны 1971 год, год XXIV з'езда КПСС, намеціўшага грандыёзную праграму камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Няхай заўсёды вашым дэвізам будуць словы Уладзіміра Ільіча Леніна: «Вучыцца, вучыцца і вучыцца». Абавязак кожнага з вас—упарта і настойліва авалодваць ведамі. Гэта неабходна для таго, каб вы змаглі з гонарам апраўдаць давер'е нашага народа на любым участку камуністычнага будаўніцтва.

Мы чакаем ад вас не толькі добрай вучобы. Вы павінны быць сапраўднымі патрыётамі нашай сацыялістычнай Радзімы, перакананымі прапагандыстамі новага камуністычнага грамадства і барацьбітамі супраць усіх і ўсялякіх праяўленняў чужой нам буржуазнай ідэалогіі.

Гэты навучальны год пачынаецца ва ўмовах, калі ўся наша краіна, увесь савецкі народ ,натхненныя гістарычнымі рашэннямі XXIV з'езда КПСС, паспяхова працуюць над выкананнем пастаўленых з'ездам задач.

Выказваем упэўненасць, што вы, учарашнія рабочыя і калгаснікі, а сёння — прадстаўнікі шматлікай студэнцкай сям'і, будзеце даражыць ганаровым імем — імем студэнта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

Жадаем вам, дарагія сябры, поспехаў у вучобе і актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці універсітэта.

У добры шлях!

РЭКТАР УНІВЕРСІТЭТА ЧЛЕН - КАРЭСПАНДЭНТ АКАДЭМІІ НАВУК БССР, ДОКТАР ТЭХНІЧНЫХ НАВУК, ПРАФЕСАР
**У. А. БЕЛЫ.**

САКРАТАР ПАРТКОМА
**У. В. КАЗЛОЎ.**

СТАРШЫНЯ МЯСЦОВАГА КАМІТЭТА ДАЦЭНТ
**І. П. ТРАЦЭЎСКІ.**

САКРАТАР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
**К. С. МОХАВА.**

СТАРШЫНЯ ПРАФКОМА
**М. Л. БАЙДА.**

## У ДОБРЫ ШЛЯХ!

НЯМНОГІМ больш двух год прайшло з часу заснавання Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Сёлета ён у трэці раз раскрывае свае дзверы перад моладзю. Цяпер, калі закончаны прыёмные экзамены, можна падвесці некаторыя вынікі.

Асноўная задача універсітэта — падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў для навукова-даследчых інстытутаў, праектных арганізацый, прадпрыемстваў і навучальных устаноў. Узрастаючая роля універсітэтаў у сістэме вышэйшай адукацыі была падкрэслена ў Справаздачным дакладзе Л. І. Брэжнева на XXIV з'ездзе Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Спецыфіка нашага універсітэта састаіць у тым, што ён заклікан адыграць значную ролю ў развіцці эканомікі, навукі і культуры Палесся. Імкненнем выканаць пастаўленыя партыяй і ўрадам адказныя задачы прасякнута ўся дзейнасць рэктарата, партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый, прыёмнай камісіі па правядзенню новага набору студэнтаў.

У адпаведнасці з Дырэктывамі XXIV з'езда КПСС па дзевятаму пяцігадоваму плану ў вну краіны пашыраецца падрыхтоўка спецыялістаў у галіне навукі і тэхнікі, якія вызначаюць навукова-тэхнічны прагрэс. У нашым універсітэце сёлета павялічыўся прыём на механіка-матэматычны факультэт, які рыхтуе спецыялістаў па матэматычнаму забеспячэнню ЭВМ, прыкладнай матэматыцы і механіцы, а таксама іншых галінах матэматыкі. Патрэбнасць у спецыялістах гэтага профілю ў нашай краіне асабліва вялікая. Больш палавіны першых выпускнікоў механіка-матэматычнага факультэта, якія заканчваюць універсітэт у будучым 1972 годзе, будуць накіраваны на работу ў інстытуты Акадэміі навук БССР, у вылічальныя цэнтры прадпрыемстваў і арганізацый Беларусі, Расійскай Федэрацыі і Украіны.

Вялікі атрад першакурснікаў уліўся сёлета ў састаў фізічнага факультэта, які рыхтуе спецыялістаў па радыёфізіцы і фізіцы цвёрдага цела для навукова-даследчых лабараторый і канструктарскіх бюро.



У паўтара разы ў параўнанні з мінулым годам павялічыўся прыём на эканамічны факультэт, які рыхтуе спецыялістаў па эканоміцы працы і арганізацыі механізаванай апрацоўцы эканамічнай інфармацыі.

Вялікія задачы па даследаванню і асваенню прыродных рэсурсаў рэспублікі стаяць перад геолагамі. Наш універсітэт — адзіная ў рэспубліцы вышэйшая навучальная ўстанова, якая рыхтуе спецыялістаў — геолагаў.

Дзякуючы пастаянным клопатам аб сваім папаўненні, універсітэт у гэтым годзе атрымаў магчымасць выбраць найбольш дастойных студэнтаў з амаль двух з паловай тысяч абітурыентаў. Хачу адзначыць, што конкурс быў на ўзроўні мінулага года. А тады ж ён быў самым высокім у рэспубліцы. Гэта гаворыць аб папулярнасці нашага універсітэта сярод моладзі.

У ліку падаўшых заявы восемдзесят чатыры медалісты і выдатнікі тэхнікумаў. Абсалютная большасць з іх пацвердзіла высокія адзнакі і залічана пасля выдатнай здачы экзаменаў па прафіліруючых дысцыплінах.

Больш 1500 абітурыентаў вытрымалі ўступныя экзамены. Абітурыент-71, па прызнанню

(Заканчэнне на 2 стар.).

...Талент, здольнасці ў якойсці галіне дзейнасці — гэта перш за ўсё здольнасці багата, упарта працаваць і мець глыбокую цікавасць да справы. Тады і праца будзе лягчэй, тады і прыйдзе поспех!

Акадэмік І. ПЯТРОЎСКІ.

